БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ

УДК 821.161.3.09(092)+821.161.09(092)

ГЛАЗМАН
Любоў Якаўлеўна

# САМАІДЭНТЫФІКАЦЫЯ АСОБЫ Ў «МАЛОЙ» ПРОЗЕ М. ГАРЭЦКАГА І Л. АНДРЭЕВА

Аўтарэферат дысертацыі на атрыманне вучонай ступені
кандыдата філалагічных навук

па спецыяльнасцях 10.01.01 – беларуская літаратура;
10.01.02 – руская літаратура

Мінск, 2018

Работа выканана ва ўстанове адукацыі «Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П. М. Машэрава»

**Навуковы кіраўнік** — **Сінькова Людміла Дзмітрыеўна**, доктар філалагічных навук, прафесар, прафесар кафедры гісторыі беларускай літаратуры Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

**Афіцыйныя апаненты:** — **Гніламёдаў** Уладзімір Васільевіч, доктар філалагічных навук, прафесар, акадэмік, галоўны навуковы супрацоўнік аддзела тэорыі і гісторыі літаратуры філіяла «Інстытут літаратуразнаўства імя Я. Купалы» ДНУ «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі»

**Сомаў** Сяргей Эдуардавіч, кандыдат філалагічных навук, дацэнт, дацэнт кафедры літаратуры і міжкультурных камунікацый УА «Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.А. Куляшова»

**Апаніруючая арганізацыя** — УА «Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт»

Абарона адбудзецца «30» лістапада 2018 г. у 14.30 на пасяджэнні савета па абароне дысертацый Д 02.01.12 пры Беларускім дзяржаўным універсітэце (220030, г. Мінск, вул. К. Маркса, 31, філалагічны факультэт, аўд. 62; тэл. вучонага сакратара: 327-61-40).

З дысертацыяй можна пазнаёміцца ў Фундаментальнай бібліятэцы Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

Аўтарэферат разасланы «29» кастрычніка 2018 г.

Вучоны сакратар савета
па абароне дысертацый — М. М. Хмяльніцкі

# УВОДЗІНЫ

Праблема самаідэнтыфікацыі асобы надзвычай востра паўстае ў «пераломныя» моманты гісторыі, калі чалавек аказваецца гвалтоўна вырваным са звыклага ладу жыцця і вымушаны праходзіць пэўныя этапы ўласнага самавызначэння. Названыя працэсы глыбока асэнсаваныя ў творчасці двух сучаснікаў, пачынальнікаў літаратурнага экспрэсіянізму ў сваіх нацыянальных традыцыях, класікаў дзвюх славянскіх літаратур – Максіма ГАРЭЦКАГА (1893 – 1938) і Леаніда АНДРЭЕВА (1871 – 1919). Яны тварылі ў адным гістарычным кантэксце на яго разломе, у момант максімальнай дынамічнасці і змены культурнай парадыгмы. Для рускай культуры і літаратуры – гэта перыяд трывожнага чакання наспелых змен, ідэйных хваляванняў і філасофстваванняў, а таксама пэўнай эстэтычнай перанасычанасці. У беларускім асяроддзі выспявалі надзеі на культурнае адраджэнне, гэта час творчага «ўсплёску» і вострага рэагавання на ўсе тыя грамадска-палітычныя зрухі, якія непасрэдна ўплывалі на развіццё нацыянальнай самасвядомасці на фоне хуткага станаўлення і развіцця новага літаратурнага працэсу. У гэтых варунках абодвух пісьменнікаў асабліва цікавіла асоба, яе маральны стан, самаўсведамленне; прычым у шырокім спектры, прэзентатыўна – менавіта ў «малой» прозе, якая рабілася найхуткай рэакцыяй на падзеі і грунтам для маштабных абагульненняў у далейшым. У творах, пазначаных як рэалістычнай, так і мадэрнісцкай паэтыкай, абодва класікі канцэнтравалі ўвагу на суаднясенні праблемы самаідэнтыфікацыі асобы з трагічнымі і лёсавызначальнымі гістарычнымі абставінамі, у якіх апынуліся славянскія народы.

***Актуальнасць*** працы вызначана каштоўнасцю таго вопыту па асэнсаванні праблем асобы ў яе повязях з гісторыяй і соцыумам, што захоўваецца ў мастацкіх тэкстах літаратурнай класікі XX ст., да якой, безумоўна, належыць «малая» проза М. Гарэцкага і Л. Андрэева. Актуальным і неабходным з'яўляецца таксама паглыбленне ведаў пра рэальную карціну беларуска-рускіх узаемасувязей з пункту гледжання літаратуразнаўства XXI ст. Акрамя таго, спецыяльныя працы, у якіх творчасць М. Гарэцкага паслядоўна супастаўлялася б з плёнам рускай літаратуры і блізкімі мастацкімі з'явамі, яскрава прадстаўленымі ў творчасці Л. Андрэева, адсутнічаюць.

Тым не менш, у сучасным літаратуразнаўстве існуе вялікая колькасць навуковых прац па прозе кожнага з даследуемых пісьменнікаў. Творчасць М. Гарэцкага сістэматычна даследавалася А. М. Адамовічам,

А. Я. Адамовічам, Дз. Я. Бугаёвым, Т. С. Голуб, В. М. Губскай, Т. М. Дасаевай, В. П. Жураўлёвым, В. А. Каваленкам, Г. В. Кажамякіным, М. М. Каратковым, А. М. Макарэвічам, М. І. Мішчанчуком, М. І. Мушынскім, Л. Д. Сіньковай, З. І. Траццяк, М. А. Тычынам, І. П. Чыгрынам, А. В. Шышко, інш. Прозе Л. Андрэева прысвечаны даследаванні Л. М. Афоніна, Л. А. Іезуітавай, В. В. Заманскай, Л. А. Калабаевай, Ф. І. Куляшова, І. І. Маскоўкінай, В. А. Мескіна, Е. А. Міхеічавай, С. Э. Сомава, С. Ю. Ясенскага, інш.

Абраная праблема кантэкстуальна закранаецца ў такіх працах, як акадэмічныя *«Нарысы па гісторыі беларуска-рускіх літаратурных сувязей: У 4 кн.»*, манаграфіях Л. А. Калабаевай *«Концепция личности в русской реалистической литературе рубежа XIX – XX веков»*, С. Э. Сомава *«Между правдой и истиной: Леонид Андреев на путях богоборчества»*, Е. А. Лявонавай *«Агульнае і адметнае: творы беларускіх пісьменнікаў XX ст. у кантэксце сусветнай літаратуры»*, а таксама дысертацыйных даследаваннях Т. М. Тарасавай «*Праблема «Чалавек і вайна» ў творчасці Максіма Гарэцкага і Анры Барбюса*», В. І. Уткевіч *«Тыпалогія нацыянальнага характару ў творчасці Кнута Гамсуна і Максіма Гарэцкага»*, З. І. Траццяк *«Ідэйна-мастацкае асэнсаванне Першай сусветнай вайны ў творчасці Э. Хемінгуэя і М. Гарэцкага»* і некаторых іншых.

Аўтары прац, прысвечаных прозе М. Гарэцкага і Л. Андрэева, не ставілі перад сабой задач канцэптуальнага аналізу праблем самаідэнтыфікацыі персанажаў у творах гэтых мастакоў з паслядоўным улікам адрозных нацыянальна-культурных традыцый. Акрамя таго, само паняцце самаідэнтыфікацыі асобы параўнаўча нядаўна актуалізавалася ў літаратуразнаўчай навуцы на яе памежжы з іншымі гуманітарнымі дысцыплінамі. Яго тэарэтычнае абгрунтаванне можна знайсці пераважна ў псіхалагічных, філасофскіх і сацыялагічных працах Э. Эрыксана, Ю. Хабермаса, А. Гідэнса, В. Хёсле, А. Ю. Шаманава, М. А. Шчарбакова, А. У. Лук'янава, А. П. Бялінскай, інш. У літаратуразнаўстве тэарэтычны аспект самаідэнтыфікацыі асобы разглядаўся ў працах М. М. Бахціна, асобных артыкулах Л. А. Сафронавай, С. С. Імяхелавай.

Аналіз апавяданняў, лірычных і філасофскіх замалёвак, мастацка-дакументальных твораў рознай ступені апрацаванасці (у творчасці М. Гарэцкага), мастацка-публіцыстычных тэкстаў (Л. Андрэева) і эпісталярыяў М. Гарэцкага і Л. Андрэева стварае магчымасці для выяўлення розных па характары і спосабе адлюстравання

самаідэнтыфікацыйных формаў, рэалізаваных у шматлікіх і разнастайных вобразах персанажаў, што выяўляе дасканаласць апавядальных тэхнік абодвух класікаў.

Супастаўленне мастацкіх формаў самаідэнтыфікацыі асобы ў творах беларускага і рускага празаікаў дазваляе таксама вызначыць разнавектарнасць аўтарскіх інтэнцый, спецыфіку светабачання двух класікаў пры вырашэнні аналагічных творчых задач.

## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

**Сувязь працы з буйнымі навуковымі праграмамі і тэмамі**

Даследаванне праведзена ў межах навуковай тэмы кафедры літаратуры ВДУ імя П. М. Машэрава: «Беларуская літаратура як дэтэрмінант і адлюстраванне духоўнага развіцця грамадства: аксіялагічны патэнцыял, эстэтычная ідэнтычнасць», уключана ў ДПФД «Беларуская мова і літаратура» (№ дзяржаўнай рэгістрацыі: 20160349. Дата рэгістрацыі: 16.03.2016). Акрамя таго, даследаванні па тэме дысертацыі праводзіліся ў рамках выканання Гранта аспіранта Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь па тэме «Самаідэнтыфікацыя асобы ў «малой» прозе Л. Андрэева і М. Гарэцкага» (№ дзяржаўнай рэгістрацыі: 20150520. Дата рэгістрацыі: 25.04.2015).

**Мэта і задачы даследавання**

**Мэта** дысертацыйнага даследавання – вызначэнне мастацкіх формаў самаідэнтыфікацыі асобы ў «малой» прозе М. Гарэцкага і Л. Андрэева ў аспекце кампаратыўнага аналізу.

Дасягненне пастаўленай мэты прадугледжвае вырашэнне наступных **задач**:

1) ахарактарызаваць праблему самаідэнтыфікацыі асобы як адну з актуальных у літаратуразнаўстве і як важны прыярытэт у мастацкім светабачанні М. Гарэцкага і Л. Андрэева;

2) выявіць ідэйна-мастацкія падыходы да раскрыцця самаідэнтыфікацыі асобы і іх сувязь з жанравым выбарам у прозе М. Гарэцкага і Л. Андрэева;

3) вызначыць спецыфіку самаідэнтыфікацыі асобы ў «малой» прозе М. Гарэцкага і Л. Андрэева ў маральным і сацыякультурным аспектах;

4) устанавіць агульнае і адметнае ў асобаснай самаідэнтыфікацыі персанажаў з твораў М. Гарэцкага і Л. Андрэева з улікам стылёвых прыярытэтаў кожнага з іх;

5) вылучыць самаідэнтыфікацыйную накіраванасць асобы ў «малой» прозе М. Гарэцкага і Л. Андрэева ва ўмовах уплыву адрозных культурна-літаратурных традыцый.

**Аб'ект і прадмет даследавання**

*Аб'ектам* даследавання з'яўляюцца мастацкія тэксты «малой» прозы і эпісталярныя тэксты М. Гарэцкага і Л. Андрэева.

*Прадмет* даследавання – мастацкія выявы самаідэнтыфікацыі асобы ў «малой» прозе М. Гарэцкага і Л. Андрэева.

**Метадалогія і метады правядзення даследавання**

Зварот да параўнальна-гістарычнага метаду, тэорыі кампаратыўнага вывучэння літаратурных з'яў дазваляюць суаднесці творчыя пазіцыі М. Гарэцкага і Л. Андрэева з улікам адрозных культурна-літаратурных традыцый; выкарыстанне культурна-гістарычнага метаду і элементаў кантэкстуальнага аналізу дае магчымасць даследаваць творчую спадчыну абраных аўтараў з улікам рэалій першай трэці ХХ стагоддзя.

**Навуковая навізна даследавання**

У дысертацыі ўпершыню праведзена канцэптуальнае супастаўленне «малой» прозы ды эпісталярных тэкстаў М. Гарэцкага і Л. Андрэева.

Ахарактарызавана праблема самаідэнтыфікацыі асобы як актуальная для літаратуразнаўства і як прыярытэтная ў мастацкім светабачанні М. Гарэцкага і Л. Андрэева;

выяўлены ідэйна-мастацкія падыходы да раскрыцця самаідэнтыфікацыі асобы і іх сувязь з жанрава-стылёвымі прыярытэтамі ў мастацкай «малой» прозе і эпісталярыях М. Гарэцкага і Л. Андрэева;

раскрыты аксіялагічны і сацыяльны аспекты адлюстравання самаідэнтыфікацыі асобы ў творах М. Гарэцкага і Л. Андрэева ў час радыкальных светапоглядных трансфармацый і грамадскіх змен;

абгрунтаваны прыёмы «ўскладненай» ідэнтычнасці («раздвоенасць» свядомасці і «маска») як адлюстраванне індывідуальна-аўтарскіх і нацыянальна-ментальных асаблівасцей «малой» прозы М. Гарэцкага (адлюстраванне нацыянальнага менталітэту, матыў сацыяльнага прыстасавання) і Л. Андрэева (супярэчлівасць чалавечай натуры, дамінаванне маральна-этычнай праблематыкі);

вызначана самаідэнтыфікацыйная скіраванасць асобы ў «малой» прозе М. Гарэцкага і Л. Андрэева ва ўмовах уплыву адрозных культурна-літаратурных кантэкстаў;

выяўлена differentнавектарнасць самаідэнтыфікацыі асобы ў мастацкай «малой» прозе і эпісталярыях М. Гарэцкага (устаноўка асобы на суіснаванне з іншымі людзьмі і жыццёвымі рэаліямі і прыняцце гэтых рэалій, на ўсвядомленае захаванне і акумуляцыю традыцыйных нацыянальных каштоўнасцей) і Л. Андрэева (індывідуалістычная асобасная ўстаноўка, адмаўленне ўсяго традыцыйнага);

істотна ўдакладнены і паглыблены веды пра рэаліі беларуска-рускіх узаемасувязей з пункту гледжання літаратуразнаўства XXI ст. на прыкладзе класічнай спадчыны М. Гарэцкага і Л. Андрэева.

**Практычная значнасць вынікаў даследавання**

Вынікі даследавання могуць быць выкарыстаны ў навучальным працэсе пры стварэнні вучэбных дапаможнікаў для студэнтаў філалагічных факультэтаў і падручнікаў для школьнікаў; пры падрыхтоўцы лекцыйных курсаў па гісторыі беларускай і рускай літаратур першай паловы XX стагоддзя ва ўстановах вышэйшай адукацыі, у самастойнай навуковай працы студэнтаў, а таксама ў працы настаўнікаў беларускай і рускай літаратур пры падрыхтоўцы да ўрокаў і факультатыўных заняткаў.

**Палажэнні, якія выносяцца на абарону**

1. Культурна-гістарычныя ўзрушэнні і светапоглядныя трансфармацыі пачатку XX стагоддзя абвастрылі праблему самаідэнтыфікацыі індывіда, што прывяло да яе актуалізацыі і вылучэння ў якасці самастойнага аб'екта даследавання ў міждысцыплінарным абсягу. Асобасная самаідэнтыфікацыя з'яўляецца феноменам, які адлюстроўвае стан чалавека і разам з тым грамадства практычна на ўсіх узроўнях: нацыянальным, сацыякультурным, эканамічным. У літаратуразнаўстве феномен самаідэнтыфікацыі трансфармуецца ў адну з самых значных характарыстык персанажа або наратара. Мастацкія тэксты прадстаўнікоў дзвюх блізкіх нацыянальных літаратур першай трэці XX стагоддзя М. Гарэцкага і Л. Андрэева надзвычай паказальныя ў інтэрпрэтацыях праблемы самаідэнтыфікацыі асобы. Літаратуразнаўчы аналіз выяўляе крызісныя станы самаідэнтыфікацыі асобы, адлюстраваныя пісьменнікамі. Наяўнасць важных сыходжанняў у прозе М. Гарэцкага і Л. Андрэева (гуманістычная, антываенная накіраванасць твораў; акцэнтаванне ўвагі на заганах грамадства: бюракратызме, крывадушнасці, перайманні чужых ідэалаў, інш.) вельмі выразна падкрэслівае якраз самабытнасць і

адрознасць рускага (крызіснасць свядомасці, пазначанай індывідуалізмам і трагізмам мадэрнісцкага светаўспрымання) і беларускага (актывізацыя працэсаў самаідэнтыфікацыі і ўсведамлення чалавекам свайго месца ў грамадстве) культурна-літаратурных працэсаў названага перыяду.

2. Самаідэнтыфікацыя асобы персанажа ў літаратурным тэксце мае сваю спецыфіку адлюстравання, паколькі з'яўляецца створанай аўтарам у рамках мастацкай умоўнасці. Літаратуразнаўчы аналіз патрабуе вылучэння пэўных параметраў і прынцыпаў, праз якія самаідэнтыфікацыя асобы раскрываецца ў творы. У «малой» прозе М. Гарэцкага і Л. Андрэева такімі параметрамі з'яўляюцца *ідэйныя падыходы і мастацкія спосабы* раскрыцця асобы і яе ўнутранага стану, партрэта і характару, якія падаюцца праз наратарскае стаўленне, паводзіны і перадачу ўласных пачуццяў і разважанняў героя, праз узаемадзеянне з іншымі персанажамі ў працэсе камунікацыі. Важным паказчыкам з'яўляюцца таксама *жанрава-стылёвыя прыярытэты* аўтараў. Такія прыярытэты выяўляюцца праз аналіз жанравай разнастайнасці «малой» прозы пісьменнікаў, а таксама праз вывучэнне паэтыкі твораў з рысамі дакументальна-мастацкімі ды экспрэсіяністскімі (М. Гарэцкі) і экспрэсіяністка-публіцыстычнымі (Л. Андрэеў). Комплекснае вывучэнне ўсіх гэтых фактараў выяўляе іх непасрэдную ўзаемасувязь з самаідэнтыфікацыйнымі характарыстыкамі персанажаў, а таксама з увасобленымі ў прозе *філасофска-светапоглядными дамінантамі* беларускага і рускага творцаў, якія вызначаюць стан асобы і яе самаідэнтыфікацыю ва ўмовах экзістэнцыйнага адчування адзіноты і адчужанасці, ілюзорнасці свету, акцэнтаванага супрацьстаяння рацыянальнага і звышнатуральнага.

3. У «малой» прозе М. Гарэцкага і Л. Андрэева знайшлі выразнае адлюстраванне падзеі пачатку стагоддзя і іх уплыў на асобасную самаідэнтыфікацыю, крызісныя праявы якой маюць цесную сувязь з радыкальнымі зменамі як на анталагічным, аксіялагічным узроўнях, так і ў самой рэчаіснасці, у цэнтры і на памежжах Расійскай імперыі. У «малой» прозе абраных аўтараў асаблівае значэнне мае самаідэнтыфікацыя асобы падчас ваенных, рэвалюцыйных падзей і ва ўмовах сацыяльнага гвалту. Акрамя інварыянтнага для ўсёй сусветнай гуманістычнай традыцыі асэнсавання самаідэнтыфікацыі асобы на агульначалавечым, агульнамаральным узроўнях, пісьменнікі паказваюць і спецыфічна-нацыянальныя самаідэнтыфікацыйныя рысы, абумоўленыя рознымі культурна-гістарычнымі абставінамі. Так, выяўляецца крызіс самаідэнтыфікацыі рускага інтэлігента, прадвызначаны пагрозай

разбурэння Расійскай Імперыі, у «малой» прозе Л. Андрэева; у творах М. Гарэцкага названая падзея, наадварот, спрыяе ўздыму нацыянальнага самаўсведамлення беларусаў.

4. У «малой» прозе М. Гарэцкага і Л. Андрэева вылучаецца феномен «несапраўднай» ідэнтычнасці (тэрмін Л. А. Сафронавай), які ўвасабляецца ў тэкстах М. Гарэцкага і Л. Андрэева ў дзвюх асноўных формах: «дваістай» свядомасці і маскі. Выяўляецца сувязь «дваістасці» свядомасці ў прозе Л. Андрэева найперш з дваістай чалавечай прыродай, у творах М. Гарэцкага – са спецыфічнай пазнакай беларускага менталітэту, акрамя сітуацый, у якіх асобе знешнімі абставінамі навязваецца дваісты стан. Вылучаюцца функцыі выкарыстання пісьменнікамі маскі: выкрыццё крывадушнасці героя, неадпаведнасць яго «я»-рэальнага створанаму вобразу ў сатырычных апавяданнях М. Гарэцкага і Л. Андрэева; спроба дыстанцавацца ад уласнага вобраза «я» і адначасова прыцягнуць увагу да сваёй асобы ў эпісталярных тэкстах Л. Андрэева.

5. У творах «малой» прозы М. Гарэцкага і Л. Андрэева самаідэнтыфікацыя асобы пазначана агульным рэгіянальным культурна-гістарычным кантэкстам. У аксіялагічным аспекце пісьменнікамі акцэнтуецца пагроза страты чалавекам каштоўнасных арыенціраў. Аднак гэтая праблема мае ў кожнага з аўтараў адрозную трактоўку. Так, у прозе Л. Андрэева выяўляецца асобасная ўстаноўка на адмаўленне ад усяго традыцыйнага, звыклага – як бунт супраць пазітывізму і «абывацельшчыны». У творах аўтара адбываецца выкрыццё фальшывых ідэалаў, адлюстроўваюцца таксама іх наступствы для самаідэнтыфікацыі асобы, спробы актывізаваць самаідэнтыфікацыйныя працэсы ў свядомасці чалавека перадусім як прадстаўніка чалавечага роду, у глабальным гуманістычным сэнсе. Проза М. Гарэцкага адлюстроўвае самаідэнтыфікацыйную накіраванасць асобы на свядомае захаванне і актуалізацыю традыцыйных нацыянальных каштоўнасцей, усведамленне дыялектычнага адзінства «дзвюх душ»; праблема самаідэнтыфікацыі асобы больш звязваецца з канкрэтнымі нацыянальна-культурнымі, сацыяльнымі, палітычнымі супярэчнасцямі, якія ціснуць на свядомасць і мараль чалавека. Выяўляецца канцэпцыя *індывідуалістычнага іcнавання* ў «малой» прозе і эпісталярыях Л. Андрэева, дзе станаўленне асобы адбываецца праз імкненне вылучыцца з асяроддзя і аддаленне ад рэальных жыццёвых абставін. У тэкстах «малой» прозы і эпісталярыях М. Гарэцкага прасочваецца канцэпцыя *суіснавання* чалавека з іншымі людзьмі і жыццёвымі рэаліямі. Самаідэнтыфікацыя чалавека адбываецца на шляху

суаднясення сябе з асяроддзем і прыняцця сябе, іншых людзей і ўмоў існавання. Такая разнавектарнасць самаідэнтычнасці асобы ў творах рускага і беларускага пісьменнікаў абумоўлена рознанакіраванасцю сацыяльна-гістарычнага, нацыянальнага развіцця Расіі і Беларусі ў першай трэці ХХ ст.

**Асабісты ўклад дысертанта**

Дысертацыя з'яўляецца самастойным навуковым даследаваннем. Артыкулы, у якіх апублікаваны вынікі даследавання, напісаны без сааўтараў.

**Апрабацыя дысертацыі і інфармацыя аб выкарыстанні яе вынікаў**

Асноўныя палажэнні дысертацыйнага даследавання прайшлі публічную апрабацыю ў якасці дакладаў на міжнародных і рэспубліканскіх навуковых і навукова-практычных канферэнцыях: V–VI, VIII–IX Міжнародных навукова-практычных канферэнцыях «Машэраўскія чытанні» (Віцебск, 29–30 верасня 2011 г., 27–28 верасня 2012 г., 16–17 кастрычніка 2014 г., 25 верасня 2015 г.); XII (57) Рэгіянальнай навукова-практычнай канферэнцыі студэнтаў і магістрантаў «Образование XXI века» (Віцебск, 29 сакавіка 2012 г.); XI Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Славянскія літаратуры ў кантэксце сусветнай: да 900-годдзя Кірыла Тураўскага і 200-годдзя Тараса Шаўчэнкі» (Мінск, 24-26 кастрычніка 2013 г.); XIX (66) – XXIII (70) Рэгіянальных навукова-практычных канферэнцыях «Наука – образованию, производству, экономике» (Віцебск, 13–14 сакавіка 2014 г., 12–13 сакавіка 2015 г., 10–11 лютага 2016 г., 9–10 лютага 2017 г., 15 лютага 2018 г.); V–VI Міжнародных навукова-практычных канферэнцыях «Мир языков: ракурс и перспектива» (Мінск, 22 красавіка 2014 г., 22 красавіка 2015 г.); Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Войны и катастрофы XX века и их осмысление в белорусской, русской и мировой литературах» (Полацк, 16–17 мая 2014 г.); XIV Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Узвышаўскія чытанні» (Мінск, 26 мая 2014 г.); XXII–XXV Міжнародных навуковых канферэнцыях Гарэцкіх чытаннях «Максім і Гаўрыла Гарэцкія: жыццё і творчасць» (Мінск, 26 чэрвеня 2014 г., 17 красавіка 2015 г., 16 чэрвеня 2016 г., 22 чэрвеня 2017); XV Міжнароднай канферэнцыі «Взаимодействие литератур в мировом литературном процессе. Проблемы теоретической и исторической поэтики» (Гродна, 18–20 верасня 2014 г.); Міжнародных навуковых чытаннях «Рэгіянальнае, нацыянальнае і агульначалавечае ў славянскіх літаратурах» (Гомель, 25–26 верасня 2014 г.); Чацвёртым

Міжнародным Кангрэсе даследчыкаў Беларусі (Коўна, 3–5 кастрычніка 2014 г.); Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Першая сусветная вайна ў народнай памяці і мастацкім адлюстраванні» (Мінск, 7–8 кастрычніка 2014 г.); V Міжнароднай навукова-практычнай моладзевай канферэнцыі «Научные стремления» (Мінск, 25–27 лістапада 2014 г.); Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі студэнтаў, аспірантаў і маладых вучоных «The Youth of the 21-st Century: Education, Science, Innovations» (Віцебск, 4 снежня 2014 г.); III Рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі маладых вучоных «Мова і літаратура ў XXI стагоддзі: актуальныя аспекты даследавання» (Мінск, 27 сакавіка 2015 г.); Міжнароднай канферэнцыі «Куляшоўскія чытанні» (Магілёў, 16 красавіка 2015 г.); Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі маладых філолагаў «Слова ў мове, маўленні, тэксце» (Брэст, 23 красавіка 2015 г.); Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Формирование и развитие национального самосознания в отражении белорусской, русской и зарубежных литератур» (Полацк, 15–16 мая 2015 г.); XXIV Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Язык и культура» (Кіеў, 22–25 жніўня 2015 г.); IX Рэспубліканскай навукова-практычнай Інтэрнэт-канферэнцыі магістрантаў, аспірантаў і маладых вучоных «Полесский регион и наука XXI века» (Мазыр, 26 чэрвеня 2015 г.); XII Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Славянскія літаратуры ў кантэксце сусветнай: да 750-годдзя са дня нараджэння Дантэ Аліг'еры і 85-годдзя Уладзіміра Караткевіча» (Мінск, 22–24 кастрычніка 2015 г.); II Рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі «Беларуская мова і літаратура ў славянскім этнакультурным кантэксце» (Віцебск, 19-20 лістапада 2015 г.); Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Беларуская літаратура ў культурнай прасторы сучаснага грамадства» (Мінск, 3–4 сакавіка 2016 г.); Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Аксиологический диапазон художественной литературы» (Віцебск, 23–24 сакавіка 2017 г.). Агульная колькасць канферэнцый – 34.

**Апублікаванасць вынікаў дысертацыі**

Па тэме даследавання апублікавана 39 прац, у тым ліку 8 артыкулаў у навуковых крыніцах, рэкамендаваных ВАК Беларусі, і рэцэнзаваных замежных выданнях (4,2 арк.); 5 публікацый у навуковых зборніках (1,5 арк.); 25 публікацый матэрыялаў навуковых канферэнцый (5,4 арк.), вучэбна-метадычныя матэрыялы (0.8 арк.). Агульны аб'ём апублікаваных матэрыялаў складае 11,9 аўтарскага аркуша.

**Структура і аб'ём дысертацыі.** Праца складаецца з уводзінаў, агульнай характарыстыкі работы, трох раздзелаў, заключэння, бібліяграфічнага спісу, які налічвае 288 найменняў прац айчынных і замежных аўтараў, з якіх 39 – публікацыі суіскальніка, дадатку. Агульны аб'ём дысертацыі складае 133 старонкі. Асноўны тэкст займае 108 старонак, бібліяграфічны спіс – 25 старонак.

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ ДЫСЕРТАЦЫІ

Першая глава **«Самаідэнтыфікацыя асобы: тэарэтычны аспект»** складаецца з двух раздзелаў.

У раздзеле 1.1 **«Вывучэнне самаідэнтыфікацыі асобы ў літаратуразнаўстве»** акрэслены літаратуразнаўчыя падыходы да названай праблемы ў працах А. У. Астахава, Н. В. Барабанавай, М. М. Бахціна, С. М. Есіна, С. С. Імяхелавай, Л. А. Сафронавай, інш.

У раздзеле 1.2 **«Творчасць М. Гарэцкага і Л. Андрэева ў літаратуразнаўчых даследаваннях»** зроблены аналітычны агляд асноўных прац, у якіх паслядоўна вывучаецца творчасць М. Гарэцкага і Л. Андрэева. Адзначаецца ўздым у галіне гарэцказнаўства і запавольванне вывучэння спадчыны Л. Андрэева ў апошнія дзесяцігоддзі; акцэнтуюцца літаратуразнаўчыя «лакуны»: невывучанасць асобных пластоў творчасці (у прыватнасці, эпісталярных тэкстаў) пісьменнікаў, малая прадстаўленасць кампаратыўных даследаванняў твораў М. Гарэцкага і Л. Андрэева ў межах вывучэння ўсходнеславянскіх літаратур.

Другая глава **«Малая» проза М. Гарэцкага і Л. Андрэева як вопыт адлюстравання самаідэнтыфікацыі персанажа ў беларускай і рускай літаратурах першай трэці XX ст.»** складаецца з трох раздзелаў і прысвечана выяўленню пэўных мастацкіх прынцыпаў адлюстравання самаідэнтыфікацыі асобы ў «малой» прозе беларускага і рускага класікаў.

У раздзеле 2.1 **«Асноўныя спосабы перадачы самаідэнтыфікацыі асобы ў «малой» прозе М. Гарэцкага і Л. Андрэева»** ўвага засяроджваецца на ідэйных падыходах да адлюстравання асобы і мастацкіх спосабах раскрыцця яе ўнутранага стану, партрэта і характару ў прозе М. Гарэцкага і Л. Андрэева. Ідэйныя падыходы робяцца відавочнымі праз наратарскае стаўленне, паводзіны, уласныя пачуцці і разважанні герояў, праз іх узаемадзеянне з іншымі персанажамі ў працэсе камунікацыі. Адпаведна вылучаюцца асноўныя спосабы перадачы самаідэнтыфікацыі ў творах пісьменнікаў: *«самапрэзентацыя»* як героя-наратара, набліжанага

да вобраза аўтара («Ідуць усе – іду я...», «Еду дамоў», М. Гарэцкага; «Ложь», «Проклятие зверя» Л. Андрэева; эпісталярыі абодвух пісьменнікаў), так і персанажа, больш дыстанцаванага ад постаці самога аўтара («Рассказ про Сергея Петровича», «Рассказ о семи повешенных», Л. Андрэева; «Маці», «Рунь» Гарэцкага); *наратарскае стаўленне* да персанажа (большасць «Сібірскіх абразкоў», «Скарб», «У 1920 годзе», «Сон» М. Гарэцкага; у мастацкай прозе Л. Андрэева распаўсюджанасці не атрымала, затое вельмі характэрна для лістоў рускага аўтара); *наяўнасць героя-«правакатара»*, што часта рэалізуецца праз увядзенне ў твор юродзівага, характэрнага для рускай культурна-літаратурнай традыцыі, або жабрака – беларускага традыцыйнага вобраза («Алёша-дурачок», «Христиане» Л. Андрэева; «Хадзяка», «Дурная», «Неразгаданыя людзі» М. Гарэцкага); *напружаная падзейнасць.* Творы абодвух аўтараў псіхалагізаваныя, шырока адлюстроўваюць палітру пачуццяў персанажаў, пры гэтым М. Гарэцкі актыўна выкарыстоўвае для перадачы самаідэнтыфікацыі асобы персанажа вобраз наратара: Л. Андрэеў пераважную ролю надае навелістычнай падзейнасці.

У раздзеле 2.2 «**Жанрава-стылёвы аспект раскрыцця самаідэнтыфікацыі асобы ў «малой» прозе М. Гарэцкага і Л. Андрэева**» выяўляюцца жанрава-стылёвыя прыярытэты аўтараў і іх уплыў на самаідэнтыфікацыйныя асаблівасці персанажаў. Звяртанне да «малой» апавядальнай формы, яе жанравая разнастайнасць у М. Гарэцкага і Л. Андрэева даюць магчымасці для шырокага аналізу варыянтаў самаідэнтыфікацыі асобы з розных пазіцый: самаўспрымання, наближанага да ўласнага, аўтарскага (дзённікавыя запісы, лісты, замалёўкі); самаідэнтыфікацыі розных сацыяльных тыпаў праз апісанне псіхалагічнага стану персанажа (апавяданні): выявдзення дамінантаў характару героя з выпадковых сустрэч (нарысы); раскрыцця ўнутранага свету персанажа ў выніку збегу абставін, праз напружанасць дзеяння (навелы); дыдактычна-павучальнага асэнсавання асобы (легенды, сказы). Калі М. Гарэцкі ў «малой» прозе імкнецца да спасціжэння асобы і яе месца ў свеце праз прызму ўласнага вопыту, выкарыстоўваючы шырокія магчымасці фактаграфічнай, дакументальна скіраванай прозы, то для рускага пісьменніка характэрны іншасказальнасць, эмацыянальна-ацэначны стыль твораў, экспрэсіўнасць, шматузроўневая рэфлексія (асабліва ў эпісталярыях) і іншыя публіцыстычныя рысы.

У раздзеле 2.3 «**Самаідэнтыфікацыя асобы ў філасофска-светапоглядным асэнсаванні пісьменнікаў**» вывучаецца ўплыў на

самаідэнтыфікацыю асобы ў творах М. Гарэцкага і Л. Андрэева пэўных светапоглядных ідэй, сфарміраваных нацыянальна-культурнымі традыцыямі і мадэрнісцкімі павевамі. Асобасны канфлікт герояў апавяданняў М. Гарэцкага цесна звязаны з забабонамі, тэмай небяспечных ведаў («Што яно?», «Страхаццё», «Дурны настаўнік», «Стары прафесар»). У творах Л. Андрэева прасочваецца ўплыў рускай класічнай традыцыі. Асабліва востра – у калядных і пасхальных творах, дзе падаецца пералом у самаідэнтыфікацыі персанажа пад уплывам свята («Баргамот и Гараська», «Из жизни штабс-капитана Каблукова»). Прычым традыцыйны матыў духоўнага ачышчэння часта трансфармуецца ў Л. Андрэева, праз расчараванне героя, у яго канчатковае маральнае падзенне («Весенние обещания»).

Героі «малой» прозы абодвух аўтараў апынуліся ў мадэрнісцкай сітуацыі разбурэння і стаўлення пад сумнеў традыцыйных каштоўнасцей. У творах «малой» прозы Л. Андрэева значнае месца займае герой-бунтар, што адмаўляе каштоўнасці папярэднікаў, у якіх бачыць толькі спажывецкія інтарэсы. Адзінае выйсце для яго – пратэст. Пісьменнік праз эстэтызацыю смерці, рэвалюцыйных і бунтарскіх настрояў, маральнага падзення асобы адлюстроўвае пэўныя маральныя скажэнні асобаснай самаідэнтыфікацыі («Молчание», «Сын человеческий»). У М. Гарэцкага падобная каштоўнасная праблематыка звязваецца з канфліктам паміж народным светаўспрыманнем з яго забабонамі і рацыяналізмам інтэлігенцыі, а дакладней – з «раздвоенасцю» ў самаідэнтыфікацыі інтэлігентаў, выхадцаў з вёскі, якім давялося шукаць новы спосаб засваення рэчаіснасці ва ўмовах гэтай супярэчнасці. Героі апавяданняў М. Гарэцкага імкнуцца спасцігнуць асновы і сутнасць жыцця, прыходзячы да сваёй самаідэнтыфікацыі праз своеасаблівае спалучэнне асобаснага, рацыянальнага і неспасцігальнага, падсвядомага, якое карэніцца ў багатай духоўнай спадчыне народа («У лазні», «Роднае карэнне»).

Светапогляд і самаідэнтыфікацыя асобы ў творах М. Гарэцкага і Л. Андрэева прадвызначаюцца супярэчлівасцю і ілюзорнасцю свету, які не падлягае рацыянальнаму тлумачэнню. У Л. Андрэева ілюзорнаць мае глабальны, агульначалавечы сэнс («В поезде», «Воскресение всех умерших», «Призраки»); у М. Гарэцкага ілюзія ствараецца яшчэ і за кошт нацыянальнага ўспрыняцця: чалавек – носьбіт таямніц свайго народа («Цёмны лес», «Патаёмнае»).

Ва ўяўленні Л. Андрэева чалавек аказваецца прыгнечаны вышэйшымі сіламі, лёсам («Ипатов», «Чемоданов»). У творах М. Гарэцкага – больш

канкрэтызаваны прасторава-часавы кантэкст. На асобу робяць уплыў канкрэтныя сацыяльна-палітычныя падзеі, якія адбываюцца на тэрыторыі краіны і робяць з людзей ахвяр – маральных і фізічных («Рускі», «На этапе»).

Трэцяя глава **«Самаідэнтыфікацыя асобы ў «малой» прозе М. Гарэцкага і Л. Андрэева ў кантэксце маральнай, нацыянальнай і сацыякультурнай праблематыкі»** складаецца з трох раздзелаў.

У раздзеле 3.1 **«Самаідэнтыфікацыя асобы падчас войнаў і рэвалюцый у «малой» прозе М. Гарэцкага і Л. Андрэева»** названая праблема даследуецца з улікам рознага для беларускага і рускага народаў гісторыка-культурнага вопыту, адрознага ўспрыняцця падзей беларускім і рускім класікамі.

У «малой» прозе Л. Андрэева больш агульная праблема катастрафічнасці быцця знаходзіцца на першым плане, і ў параўнанні з ёй уласна ваенная праблематыка прадстаўлена лакальна («Ночной разговор»). У большасці твораў пазначанага перыяду выяўляецца самаідэнтыфікацыйная разгубленасць і маральная нясталасць асобы, раней далёкай ад неабходнасці самаўсведамлення і залішніх рэфлексіўных перажыванняў. У новай, нязвыклай сітуацыі героі пачынаюць бяздумна мяняць навязаныя звонку стэрэатыпы, лёгка паддаюцца эмацыянальным парыванням, губляюцца ў нетыповай для іх сітуацыі, калі павышаецца адказнасць за ўласныя дзеянні («В темную даль», «Тьма», «Иван Иванович»). Акцэнтуецца беспадстаўнасць ахвяравання чалавекам рэальным жыццём дзеля невядомай прывабнасці («Рассказ о семи повешенных»). Пазначаныя з'явы разбурэння самаідэнтычнасці выяўляюцца, напрыклад, праз прыём «непазнавання» («Из рассказа, который никогда не будет окончен»).

Героі твораў М. Гарэцкага аказваюцца ў процілеглай сітуацыі, паказваючы актывізацыю самаідэнтыфікацыйных працэсаў або ідавочнае разуменне іх неабходнасці («У 1920 годзе», «Усебеларускі з'езд 1917-га года», «Палонны»). У шырока прадстаўленай ваеннай праблематыцы ў «малой» прозе М. Гарэцкага акрамя агульнамаральных праблем выяўляецца асэнсаванне пералому ў свядомасці беларуса, што звязана з уяўленнямі пра ўсталяванне поўнай дэмакратычнай, гуманістычнай і нацыянальнай справядлівасці, пра самакаштоўнасць беларуса як прадстаўніка асобнай нацыі і адраджэнне культурных каштоўнасцей цэлага народа.

Раздзел 3.2 **«Самаідэнтыфікацыя асобы ва ўмовах сацыяльных супярэчнасцей»** вызначае ўплыў на маральны стан і самаўспрыманне асобы ў творах М. Гарэцкага і Л. Андрэева сацыяльнага гвалту.

У сацыяльна завостранай «малой» прозе М. Гарэцкага найважнейшым складнікам самаідэнтыфікацыі асобы з'яўляецца ўсведамленне персанажамі праблем, звязаных з блізкім колам людской супольнасці (сям'я, аднавяскоўцы, агульнае гістарычнае мінулае: «Роднае карэнне», «Прысяга», «Скарб»), а таксама з усведамленнем агульных задач адраджэння беларускай нацыі («Рунь», «Фантазія»). У прозе Л. Андрэева на першым плане – узаемаабумоўленасць сацыяльнага і маральна-этычнага ў завершаным цэлым пэўнай асобы, без тых акцэнтаў на нацыянальнай праблематыцы, якія яскрава аформіліся ў беларускай літаратуры пачатку XX ст.; многія творы маюць вострую сацыяльную скіраванасць і канкрэтную сацыяльную адрасацыю («Защита», «Случай», «Утенок»), а вобразы персанажаў з неадэкватнай самаідэнтыфікацыяй дазволілі Л. Андрэеву адлюстраваць крызісныя з'явы ва ўнутраным свеце чалавека («Рассказ о Сергее Петровиче», «В подвале»); той збой, у выніку якога ў грамадскай думцы разбураліся выверaныя агульнапрынятыя нормы сацыяльнага парадку. У рускай літаратуры напярэдадні распаду Расійскай імперыі менавіта гэты ракурс у асэнсаванні рэчаіснасці быў надзвычай актуальным.

Акцэнтуецца значнасць сацыяльнага пратэсту ў прозе рускага аўтара. Маральна моцная асоба для Л. Андрэева – тая, якая жыве насуперак агульнапрынятым нормам, якая найменш ідэнтыфікуе сябе з сацыяльным колам, не паддаецца спакусе лёгкага існавання «як усе» («Сын человеческий», «Полет», лісты 1903, 1904 гг.). Такая самаідэнтычнасць адпавядае агульнамадэрнісцкай канцэпцыі асобы, якая складвалася ў літаратурным асяроддзі пачатку XX стагоддзя. У прозе М. Гарэцкага асобасны пошук адбываецца не праз адмаўленне, а праз атаясамліванне ўласнай асобы з іншымі людзьмі і экзістэнцыйнае ўсведамленне адказнасці за сябе і іншых («Стогны душы», «Ідуць усе – іду я...», лісты да Л. У. Гарэцкай 1931, 1932 гг.). Такая ўстаноўка на суіснаванне з жыццёвымі рэаліямі, прыняцце складаных сітуацый адлюстроўвае асаблівасці беларускай ментальнасці. У адрозненне ад Л. Андрэева, героі апавяданняў і наратар лістоў якога заўсёды шмат увагі надаюць рэфлексіі, М. Гарэцкі негатыўна ставіцца да залішняй рэфлексіўнасці (што бачым у недатаваным лісце да невядомага вучня). Аналіз эпісталярных тэкстаў

М. Гарэцкага і Л. Андрэева дазваляе выявіць разнавектарнасць самаідэнтыфікацыйнай скіраванасці пісьменнікаў.

Раздзел 3.3 **«Праблема «несапраўднай» ідэнтычнасці ў «малой» прозе М. Гарэцкага і Л. Андрэева»** складаецца з двух падраздзелаў і прысвечаны феномену «ўскладненай» ідэнтычнасці, калі рэальны вобраз «я» ў свядомасці персанажа не супадае з надуманым, з тым, як герой сябе пазіцыянуе.

У падраздзеле 3.3.1 **«Дваістасць свядомасці» ў «малой» прозе М. Гарэцкага і Л. Андрэева»** даследуюцца супярэчлівасці ў самаідэнтыфікацыі персанажаў, выкліканыя «раздвоенай» свядомасцю.

У шэрагу твораў «малой» прозы М. Гарэцкага і Л. Андрэева паказана станаўленне асобы, якое адбываецца праз пераадоленне двaістасці свядомасці, або сама двaістасць з'яўляецца імператывам асобаснага станаўлення (М. Гарэцкі – «У лазні», «Роднае карэнне», «Рунь», «Амерыканец»; Л. Андрэеў – «Из жизни штабс-капитана Каблукова», «Иностранец», «Проклятие зверя»). Мае месца таксама адмоўны ўплыў такога «накладання» ідэнтычнасцей, у выніку якога адбываецца не станаўленне, а разбурэнне асобы, няздольнай пераадолець асобасны разлад, прадвызначаны «двaістым» станам асобы (М. Гарэцкі «Рускі», «На этапе», «Супакой»; Л. Андрэеў «Петька на даче», «Гостинец», «Бездна». У Л. Андрэева праявы двaістасці звязаны пераважна з супярэчлівасцю чалавечай прыроды, бясконцай барацьбой дзвюх жыццёвых асноў: абывацельскай, жывёльнай і чалавечай, духоўнай. У творчасці М. Гарэцкага з'ява «двудушнасці» ў дадатак да названага набывае спецыфічна нацыянальныя якасці, выступаючы неад'емным складнікам нацыянальнага менталітэту і з'яўляючыся неабходным этапам у набыцці героем уласнай ідэнтычнасці (у выпадках па-за ціскам знешніх гістарычных абставін).

Падраздзел 3.3.2 **«Маска як праява «несапраўднай» ідэнтычнасці ў «малой» прозе М. Гарэцкага і Л. Андрэева»** прысвечаны прыёму ўтойвання персанажам уласнай сутнасці пад маскай, якое разглядаецца намі як двaістасць паводзін персанажаў. Маска як спроба героя падмануць грамадства выкарыстоўваецца аўтарамі пераважна ў сатырычных або гумарыстычных творах («Оригинальный человек», «Нет прощения», «Рогоносцы» Л. Андрэева, «Апостал», «[Незадача]», «Інтэлігенты» М. Гарэцкага); страта самаідэнтычнасці, пэўнае зрастанне з маскай характэрна для твораў Л. Андрэева з драматычным і нават трагічным пафасам («Смех», «Ложь»).

У творах з падобнай «несапраўднай» ідэнтычнасцю персанажаў гумар і сатыра рускага аўтара накіраваныя на заганы грамадства ў цэлым, без культурна-нацыянальных пазнак. Для адпаведных па мастацкім модусе твораў М. Гарэцкага характэрна большая ўпісанасць у канкрэтную гістарычную сітуацыю, якая склалася на тэрыторыі Беларусі і за яе межамі ў раннесавецкія гады; аб'ектам сатыры з'яўляецца не толькі соцыум як такі, але і новы палітычны лад.

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

### Асноўныя навуковыя вынікі дысертацыі

1. Самаідэнтыфікацыя асобы як катэгорыя на працягу ХХ стагоддзя аформілася ў якасці самастойнага праблемнага поля і набыла міждысцыплінарны статус у галіне гуманітарных ведаў. Ва ўмовах глабалізацыйных працэсаў і пашыранага постмадэрнісцкага светаадчування феномен самаідэнтыфікацыі асобы прыцягвае ўсё большую ўвагу даследчыкаў. Пашырэнне такой увагі звязана з крызіснымі з'явамі ў свядомасці індывіда, прадвызначанымі найперш радыкальнымі светапоглядны мі і сацыякультурнымі зменамі пачатку ХХ стагоддзя, тымі хваляваннямі, што ахапілі ўвесь свет і прывялі да дзвюх сусветных войнаў. Філасофскія, сацыялагічныя, псіхалагічныя, культуралагічныя даследаванні дазваляюць вылучыць агульныя характарыстыкі феномена самаідэнтыфікацыі асобы: яго крызісную прыроду, дыялагічнасць, культурна-гістарычную абумоўленасць. Усё пералічанае характэрна для выяў самаідэнтыфікацыі асобы ў тэкстах мастацкай літаратуры. Адлюстраванне самаідэнтыфікацыйных праблем у «малой прозе» і эпісталярыях М. Гарэцкага і Л. Андрэева абумоўлена не толькі патрэбамі часу, але і спецыфічнай скіраванасцю таленту кожнага з пісьменнікаў. Літаратуразнаўчы аналіз выяўляе крызісныя станы самаідэнтыфікацыі асобы, намаляваныя абодвума пісьменнікамі, а таксама наяўнасць важных сыходжанняў у мастакоўскіх пазіцыях. У першую чаргу, гэта гуманістычная, антываенная накіраванасць твораў Л. Андрэева («Рассказ о семи повешенных», «Ночной разговор») і М. Гарэцкага («Літоўскі хутарок», «Генерал»); акцэнтаванне ўвагі на заганах грамадства – бюракратызме, крывадушнасці, перайманні чужых ідэалаў у апавяданнях Л. Андрэева («Первый гонорар», «Христиане») і М. Гарэцкага («Ашуканы палітрэдактар», «Прастуда містэра Рамзая»). Аднак ідэйныя сыходжанні

вельмі выразна падкрэсліваюць якраз самабытнасць і адрознасць не толькі індывідуальных стыляў Л. Андрэева і М. Гарэцкага, але і ў цэлым рускіх і беларускіх літаратурных традыцый, прыярытэтаў у асэнсаванні рэчаіснасці названага перыяду. Так, Л. Андрэеў засяроджвае ўвагу на крызісе той свядомасці, што пазначана індывідуалізмам і трагізмам мадэрністычнага светаўспрымання («Елеазар», «Полет»). М. Гарэцкі адлюстроўвае ў першую чаргу актывізацыю працэсаў самаідэнтыфікацыі і ўсведамлення чалавекам свайго месца ў грамадстве («Роднае карэнне», «Усебеларускі з'езд 1917-га года») [1; 2; 3; 4; 10; 26; 29].

2. Самаідэнтыфікацыя асобы персанажа мае спецыфічна-літаратурныя рысы, наколькі патрабуе ўліку ідэйнай накіраванасці твора, долі мастацкай умоўнасці, разгляду асобы як носьбіта аўтарскай інтэнцыі, накіраванай на чытацкае ўспрыманне. Гэта прадвызначае неабходнасць вылучэння пэўных характарыстык, якія дазваляюць даследаваць асобасную самаідэнтыфікацыю ў прозе М. Гарэцкага і Л. Андрэева. Сярод такіх параметраў вылучаюцца ідэйныя падыходы і мастацкія спосабы раскрыцця характару і ідэнтычнасці героя, жанрава-стылёвая арганізацыя твора і філасофска-светапоглядныя дамінанты ў ім. Асноўнымі спосабамі перадачы самаідэнтыфікацыі героя ў «малой» прозе Л. Андрэева і М. Гарэцкага з'яўляюцца: «самапрэзентацыя» («Рассказ о Сергее Петровиче», «Проклятие зверя» Л. Андрэева, «Рунь», «Ідуць усе – іду я...» М. Гарэцкага, эпісталярныя тэксты абодвух пісьменнікаў), наратарскае стаўленне да персанажа (лісты Л. Андрэева да Н. А. Чукмалдзінай і М. Горкага, «Скарб», большасць «Сібірскіх абразкоў» М. Гарэцкага), наяўнасць героя-«правакатара» («Алёша-дурачок», «Случай» Л. Андрэева, «Хадзяка», абразок «Дурная» М. Гарэцкага), напружаная падзейнасць (навелы абодвух аўтараў). «Правакатыўную» функцыю ў прозе абодвух аўтараў найчасцей выконваюць вобразы юродзівага (спецыфічны для рускай літаратуры) і жабрака (адметнасць беларускай культурна-літаратурнай традыцыі), праз рэакцыю на якіх паказваецца самаідэнтычнасць іншых герояў твора. Жанравая разнастайнасць, наяўнасць жанравых мадыфікацый у прозе абодвух пісьменнікаў, напружанасць дзеяння і шырокая прадстаўленасць тыпаў персанажаў як адметнасці «малой» прозы, а таксама асаблівасці творчых метадаў М. Гарэцкага і Л. Андрэева даюць магчымасці для шырокага аналізу варыянтаў самаідэнтыфікацыі асобы. У той прозе Гарэцкага, якая пазначана фактаграфізмам і дакументальнай скіраванасцю, рэалістычнай тыпізацыяй, прыярытэтным з'яўляецца выкарыстанне магчымасцей жанру

для адлюстравання канкрэтных самаідэнтыфікацыйных узроўняў у свядомасці персанажа. Самаідэнтыфікацыя герояў у творах Андрэева абумоўліваецца акцэнтам у жанравых формах на магчымасцях іншасказальнасці і экспрэсіўных мастацкіх сродкаў. У філасофска-светапоглядным аспекце адзначаецца як агульнае ў асэнсаванні асобаснай ідэнтычнасці ў «малой» прозе пісьменнікаў, так і адметнае, абумоўленае рознымі нацыянальнымі культурна-літаратурнымі традыцыямі. Матывы ілюзорнасці жыцця, канфлікту паміж рацыянальным і неспасцiжным, страта традыцыйных каштоўнасцей, пазначаныя мадэрнісцкім светаадчуваннем, па-рознаму ўплываюць на самаідэнтыфікацыю персанажаў у прозе Л. Андрэева, які выкрывае былыя каштоўнасці і крывадушнасць абывацеляў («Призраки», «Ипатов»), і М. Гарэцкага, у прозе якога каштоўнасная праблематыка звязана з пошукам балансу паміж народным, забабонным і рацыянальным светаўспрыманнем («Што яно?», «Дурны настаўнік») [1; 3; 5; 7; 11; 13; 24; 26; 28; 32; 33; 38].

3. На самаідэнтыфікацыю асобы непасрэдна ўплываюць радыкальныя сацыяльныя змены, што выразна адлюстроўваюць творы рускага і беларускага класікаў з ваеннай, рэвалюцыйнай тэматыкай, а таксама апавяданні, у якіх адлюстраваны праявы сацыяльнага гвалту. У прозе Л. Андрэева на першым плане самаідэнтыфікацыйная разгубленасць, маральная нясталасць і непадрыхтаванасць асобы да рэзка супярэчлівых сітуацый. Такі стан чалавека звязваецца Л. Андрэевым з агульнамаральнымі абагульненнямі (напрыклад, з вызначэннем філасофскай сутнасці катэгорый рабства і волі) і настроямі трагічнага светаадчування напярэдадні Першай сусветнай вайны. Усё гэта выяўляе крохкасць самаідэнтыфікацыі на сацыяльным ўзроўні, што ўвасабляецца як у вобразах тэрарыстаў, рэвалюцыйных дзеячаў, так і ў адлюстраванні прадстаўнікоў улады («Губернатор», «Из рассказа, который никогда не будет окончен», «Иван Иванович»). Для М. Гарэцкага ў раскрыцці канкрэтных гістарычных падзей было важна праз асэнсаванне характару беларуса і сцвярджэнне нацыянальных каштоўнасцей актуалізаваць праблему нацыянальнай самасвядомасці, таму найважнейшым складнікам самаідэнтыфікацыі асобы ў творах Гарэцкага з'яўляецца ўсведамленне персанажамі праблем, звязаных з блізкім колам людской супольнасці (сям'я, аднавяскоўцы, агульнае гістарычнае мінулае), а таксама з усведамленнем агульных задач адраджэння беларускай нацыі («Рунь», «Фантазія», «У 1920 годзе») [2; 4; 9; 10].

4. Для «малой» прозы М. Гарэцкага і Л. Адрэева характэрны феномен «несапраўднай» ідэнтычнасці, які рэалізуецца праз «дваістаць» свядомасці і прыём маскіравання ды звязваецца з ускладненнем самаідэнтыфікацыі персанажа і ідэнтыфікацыі яго іншымі героямі. У абодвух аўтараў дадзеная з'ява адлюстроўвае пэўны асобасны разлад, унутраны канфлікт паміж рэальным «я» і ўяўным, да якога (або да стварэння ўражання якога) імкнецца герой; аднак праявы і характар феномена – розныя. Рускі аўтар у адлюстраванні дваістай свядомасці акцэнтуе супярэчлівасць прыроды чалавека, барацьбу жывёльнага і чалавечага пачаткаў («Предстояла кража», «Бездна»); хаванне пад маскай звязваецца ў Л. Андрэева з дамінаваннем маральна-этычнай праблематыкі і рэалізуецца ў стварэнні фарсавай сітуацыі («Оригинальный человек», «Рогоносцы»), а таксама выконвае функцыю дыстанцавання наратара ад уласнага вобраза «я» і прыцягвання ўвагі да ўласнай асобы ў эпісталярыях пісьменніка. У М. Гарэцкага стан «двудушнасці» набывае яшчэ і спецыфічна нацыянальныя якасці, выступае неад'емным складнікам нацыянальнага менталітэту як неабходнай ўмовай набыцця героем уласнай ідэнтычнасці («У лазні», «Амерыканец»); маскіраванне персанажаў мае востра сатырычны характар і рэалізуе матыў сацыяльнага прыстасавання (як правіла, да новай улады) («[Пезадача]», абразок «Інтэлігент») [6; 12; 27; 31; 35].

5. М. Гарэцкі і Л. Андрэеў адлюстроўвалі самаідэнтыфікацыю асобы ў кантэксце агульнамаральных праблем у час страты чалавекам каштоўнасных арыенціраў, у агульнай сітуацыі супярэчлівых, крывавых гістарычных падзей першай трэці XX стагоддзя. Аднак праблема самаідэнтыфікацыі асобы ў творах «малой» прозы кожнага з пісьменнікаў мае спецыфічныя рысы, што абумоўлена рознымі культурна-літаратурнымі традыцыямі, разнавектарнасцю гістарычнага і сацыяльнага развіцця. Л. Андрэеў паказвае асобу ва ўмовах выяўлення нежыццяздольнасці звыклых ідэалаў, выяўляе крызіс яе самаідэнтыфікацыі на агульнамаральным узроўні. М. Гарэцкі робіць відавочнай неабходнасць нацыянальнай самаідэнтыфікацыі ў канкрэтных гістарычных абставінах, што магчыма праз свядомае захаванне героямі нацыянальных каштоўнасцей і дыялектычнага адзінства «дзвюх душ». У мастацкай «малой прозе» і эпісталярыях Л. Андрэева прасочваецца канцэпцыя індывідуалістычнага існавання. Станаўленне асобы адбываецца праз імкненне вылучыцца з безасабовай масы людзей, праз аддаленне ад рэальных жыццёвых абставін («Тьма», «Елеазар», «Полет»). У выніку ў свядомасці асобы рэчаіснасць набывае рысы абсурду або фантасмагорыі.

Таму найчасцей у мастацкай «малой» прозе назіраецца своеасаблівае маральнае «самаразбурэнне» асобы, якое прыводзіць да страты чалавекам самаідэнтычнасці, што прадвызначае вар'яцтва, смерць героя і г.д. («Рассказ о Сергее Петровиче», «Бездна», «Сын человеческий»). У эпісталярыях і мастацкай «малой» прозе М. Гарэцкага прасочваецца канцэпцыя суіснавання чалавека з іншымі людзьмі і жыццёвымі рэаліямі – нават калі гэта змрочна-фантасмагарычныя і абсурдныя рэаліі, адлюстраваныя Гарэцкім у больш аб'ёмных эпічных формах 1930-х гг.: дзённікавых запісах Лявоніуса Задумекуса, філасофскай алегорыі «Скарбы жыцця». Самаідэнтыфікацыя чалавека адбываецца на шляху суаднясення сябе з асяроддзем і прыняцця сябе, іншых людзей і ўмоў існавання («У лазні», «Роднае карэнне», «Рунь», «Ідуць усе – іду я»). У выніку фарміруецца маральна сталая асоба з высокім узроўнем асобаснай і сацыяльнай ідэнтычнасці. Адрозненні ў скіраванасці асобасных пошукаў М. Гарэцкага і Л. Андрэева былі сфарміраваны пад уплывам розных умоў нацыянальна-культурнага развіцця беларусаў і расіян на пераломе XIX і XX стагоддзяў [3; 4; 8; 16; 25].

## Рэкамендацыі па практычным выкарыстанні вынікаў

Матэрыялы і вынікі навуковай работы могуць быць выкарыстаны для далейшага параўнальнага вывучэння беларускай і рускай літаратур першай трэці XX ст. і мяжы XX – XXI ст.ст., даследаванняў на сумежжы літаратуразнаўства і іншых дысцыплін гуманітарнага профілю (культуралогіі, сацыялогіі, філасофіі); пры стварэнні навучальных дапаможнікаў па гісторыі беларускай і рускай літаратур пазначанага перыяду, тэорыі літаратуры; у адукацыйнай практыцы.

## СПІС ПУБЛІКАЦЫЙ ПА ТЭМЕ ДЫСЕРТАЦЫІ

### Артыкулы ў выданнях, рэкамендаваных ВАК Рэспублікі Беларусь, і ў рэцэнзаваных замежных выданнях

1. Глазман, Л. Я. «Таямніцы жыцця» ў апавяданнях М. Гарэцкага і Л. Андрэева / Л. Я. Глазман // Роднае слова. – 2014. – № 9. – С. 19–22.

2. Глазман, Л. Я. Асэнсаванне нацыянальнай праблематыкі ў кантэксце ваеннай катастрофы ў «малой» прозе М. Гарэцкага / Л. Я. Глазман // Вестник Полоцкого государственного университета. Сер. А, Гуманитарные науки. – 2014. – № 10. – С. 36–40.

3. Глазман, Л. Я. Адлюстраванне самаідэнтыфікацыі асобы ў апавяданнях Максіма Гарэцкага і Леаніда Андрэева / Л. Я. Глазман // Роднае слова. – 2015. – № 6. – С. 15–19.

4. Глазман, Л. Я. Праблема нацыянальнага самавызначэння ў апавяданнях М. Гарэцкага і Л. Андрэева пра ваенныя і рэвалюцыйныя падзеі пачатку XX ст. / Л. Я. Глазман // Acta Albaruthenica. – Warszawa. Tom 15. – Warszawa: Katedra Białorutenistyki Uniwersytetu Warszawskiego, 2015. – С. 57–68.

5. Глазман. Л. Я. Самаідэнтыфікацыя асобы ў філасофскім асэнсаванні пісьменніка (на матэрыяле апавяданняў Леаніда Андрэева і Максіма Гарэцкага) / Л. Я. Глазман // Полымя. – 2015. – № 8. – С. 124–128.

6. Глазман, Л. Я. Проблема затрудненной идентичности в «малой» прозе Л. Андреева и М. Горецкого / Л. Я. Глазман // Мова і культура. – Вип. 18. – Т. I (98). – Київ, 2015. – С. 36–41.

7. Глазман, Л. Я. Жанравы аспект адлюстравання самаідэнтыфікацыі асобы ў «малой» прозе М. Гарэцкага і Л. Андрэева / Л. Я. Глазман // Białorutenistyka Białostocka, т. 7. – Białystok: Wydawnictwo Uniwersytetu w Białymstoku, 2015. – С. 419–426.

8. Глазман, Л. Я. Проблема передачи нарраторской самоидентификации в эпистоляриях Л. Андреева и М. Горецкого [Электронный ресурс] / Л. Я. Глазман // Гуманитарный научный вестник. – 2018. – № 3. – С. 1–8. – Режим доступа: http://naukavestnik.ru/doc/gv1803Glazman.pdf. – Дата доступа: 30.03.2018.

### Артыкулы ў навуковых зборніках

9. Глазман, Л. Я. Сацыяльныя парадоксы ў «малой» прозе Л. Андрэева і М. Гарэцкага / Л. Я. Глазман // Антропологические сдвиги переломных эпох и их отражение в литературе : сб. науч. ст. : в 2 ч. Ч. 1 / Гродн. гос.

ун-т им. Я. Купалы; ред. кол.: Т. Е. Автухович (гл. ред.) [и др.]. – Гродно : ГрГУ, 2014. – С. 196–201.

10. Глазман, Л. Я. Адлюстраванне нацыянальнай самасвядомасці ў апавяданні М. Гарэцкага «У 1920 годзе» / Л. Я. Глазман // Сб. науч. статей студентов, магистрантов, аспирантов / Белорус. гос. ун-т, Факультет международных отношений ; сост. С. В. Анцух ; под общ. ред. В. Г. Шадурского. – Минск : БГУ, 2015. - Вып. 14. – С. 193–195.

11. Глазман, Л. Я. Прэзентацыя асобы ў «малой» прозе Максіма Гарэцкага і Леаніда Андрэева / Л. Я. Глазман // Актуальныя праблемы філалогіі і методыкі выкладання філалагічных дысцыплін : зб. навук. арт. / Магіл. дзярж. ун-т імя А. А. Куляшова ; пад агул. рэд. А. М. Макарэвіча. – Магілёў : МДУ імя А. А. Куляшова, 2015. – С. 127–132.

12. Глазман. Л. Я. Маска як праява несапраўднай ідэнтычнасці ў апавяданнях Леаніда Андрэева і Максіма Гарэцкага / Л. Я. Глазман // Слова ў мове, маўленні, тэксце : зб. навук. арт. / Брэсц. дзярж. ун-т ; пад агул. рэд. Н. Р. Якубук; рэдкал.: Я. І. Абрамава [і інш.]. – Брэст : БрДУ, 2015. – С. 35–38.

13. Глазман. Л. Я. Ілюзія і рэальнасць у «малой» прозе Л. Андрэева і М. Гарэцкага // Аксиологический диапазон художественной литературы : сб. науч. ст. / Витеб. гос. ун-т ; сост. В. Ю. Боровко [и др.] ; под науч. ред. В. Ю. Боровко, О. В. Лапатинской. – Витебск : ВГУ имени П. М. Машерова. – С. 46–48.

### Матэрыялы на навуковых і навукова-практычных канферэнцыях

14. Глазман, Л. Я. Формализация социальных отношений в рассказах Л. Н. Андреева / Л. Я. Глазман // V Машеровские чтения : материалы международной научно-практической конференции студентов, аспирантов и молодых ученых, Витебск, 29–30 сентября 2011 г. / Витебский гос. ун-т; редкол.: А. П. Солодков (гл. ред.) [и др.]. – Витебск : ВГУ имени П. М. Машерова, 2011. – С. 142–143.

15. Глазман, Л. Я. Пасхальные метаморфозы в рассказах Л. Н. Андреева / Л. Я. Глазман // Образование XXI века : материалы XII (57) Региональной научно-практической конференции студентов и магистрантов, Витебск, 29–30 марта 2012 г. / Витебский гос. ун-т; редкол.: А. П. Солодков (гл. ред.) [и др.]. – Витебск : ВГУ имени П. М. Машерова, 2012. – С. 145–146.

16. Глазман, Л. Я. Саморазрушение личности в рассказах Л. Н. Андреева / Л. Я. Глазман // VI Машеровские чтения : материалы международной научно-практической конференции студентов, аспирантов и молодых ученых, Витебск, 27–28 сентября 2012 г. / Витебский гос. ун-т ; редкол.: А. П. Солодков (гл. ред.) [и др.]. – Витебск : ВГУ имени П. М. Машерова, 2012. – С. 224.

17. Глазман, Л. Я. Созидание человеком себя и мира в рассказах Л. Н. Андреева / Л. Я. Глазман // Славянскія літаратуры ў кантэксце сусветнай : да 900-годдзя Кірыла Тураўскага і 200-годдзя Тараса Шаўчэнкі : матэрыялы XI Міжнароднай навуковай канферэнцыі, Мінск, 24–26 кастрычніка 2013 г. : у 2 ч. Ч. 2 / пад рэд. Т. П. Казаковай. – Мінск, 2013.– С. 34–39.

18. Глазман, Л. Я. Художественное осмысление привычного существования в рассказах Л. Н. Андреева / Л. Я. Глазман // Наука – образованию, производству, экономике : материалы XIX (66) Региональной научно-практической конференции преподавателей, научных сотрудников и аспирантов, Витебск, 13–14 марта 2014 г. : в 2 т. / Вит. гос. ун-т ; редкол.: И. М. Прищепа (гл. ред.) [и др.]. – Витебск : ВГУ имени П. М. Машерова, 2014. – Т. 1. – С. 146–147.

19. Глазман, Л. Я. Вобраз іншаземца ў апавяданнях М. Гарэцкага «Амерыканец» і Л. Андрэева «Іншаземец» / Л. Я. Глазман // Мир языков : ракурс и перспектива : материалы V Международной научно-практической конференции, Минск, 22 апреля 2014 г. : в 2 т. / редкол.: Н. Н. Нижнева (отв. редактор) [и др.]. – Минск: БГУ, 2014. – Т. 1. – С. 176–181.

20. Глазман, Л. Я. Отражение сущности войны в рассказе Л. Н. Андреева «Ночной разговор» / Л. Я. Глазман // VIII Машеровские чтения : материалы международной научно-практической конференции студентов, аспирантов и молодых ученых, Витебск, 16–17 октября 2014 г. / Витебский гос. ун-т; редкол.: И. М. Прищепа (гл. ред.) [и др.]. – Витебск : ВГУ имени П. М. Машерова , 2014. – С. 149–150.

21. Глазман, Л. Я. Дети в системе персонажей рассказов Л. Андреева / Л. Я. Глазман // Научные стремления – 2014 : сборник материалов V Международной научно-практической молодежной конференции (25–27 ноября 2014 года, Минск) / ООО «Лаборатория интеллекта» и Центр молодежных инноваций. - Минск : «Энциклопедикс» , 2014. – С. 52–54.

22. Glazman, L. The Representation of the Foreigner in L. Andreyev's and M. Goretsky's Short Stories / L. Glazman // The Youth of the 21st Century : Education, Science, Innovations : materials of the International Conference for

Students, Postgraduates and Young Scientists; Vitebsk, December 4, 2014 / Vitebsk State University ; Editorial board.: I. M. Prischepa (editor in chief.) [and others]. – Vitebsk : VSU named after P. M. Masherov, 2014. – P. 168–169.

23. Глазман, Л. Я. Нацыянальнае і агульначалавечае ў ваенных апавяданнях М. Гарэцкага і Л. Андрэева / Л. Я. Глазман // Першая сусветная вайна ў народнай памяці і мастацкім адлюстраванні : матэрыялы Міжнароднай навуковай канферэнцыі (Мінск, 7–8 кастрычніка 2014 г.) / прадм. і ўклад. С. Л. Гараніна ; навук. рэд. А. І. Лакотка ; Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі. – Мінск, 2014. – С. 160–163.

24. Глазман, Л. Я. Трансфармацыя вобразаў юродзівага і жабрака ў апавяданнях М. Гарэцкага і Л. Андрэева / Л. Глазман // Максім і Гаўрыла Гарэцкія : жыццё і творчасць (да 100-годдзя Першай і 75-годдзя Другой сусветных войнаў) : матэрыялы XXII Гарэцкіх чытанняў / Дзярж. музей гісторыі бел. літ., Рэспубліканскі фонд імя братоў Гарэцкіх, Цэнтр даследав. бел. культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі ; адк. рэд. Р. Гарэцкі. – Мінск : выд. В. Хурсік, 2014. – С. 59–64.

25. Глазман, Л. Я. Кризис идентичности в рассказах Л. Андреева «Сын человеческий» и М. Горецкого «Дурны настаўнік» / Л. Я. Глазман // Наука – образованию, производству, экономике: материалы XX (67) Региональной научно-практической конференции сотрудников и аспирантов, Витебск, 12–13 марта 2015 г. : в 2 т. / Вит. гос. ун-т; редкол. И. М. Прищепа (гл. ред.) [и др.]. – Витебск : ВГУ имени П. М. Машерова, 2015. – Т. 1. – С. 102–103.

26. Глазман, Л. Асаблівасці мадэрнісцкага светабачання ў апавяданнях Максіма Гарэцкага / Л. Глазман // Мова і літаратура ў XXI стагоддзі: актуальныя аспекты даследавання : матэрыялы III Рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі маладых вучоных, Мінск, 27 сакавіка 2015 г. / рэдкал.: П. І. Навойчык (адк. рэд.) [і інш.] ; Бел. дзярж. ун-т. – Мінск : БДУ, 2015. – С. 92–95.

27. Глазман, Л. Праблема дваістасці ў апавяданнях М. Гарэцкага і Л. Андрэева / Л. Глазман // Максім і Гаўрыла Гарэцкія : жыццё і творчасць (да 115-годдзя з дня нараджэння Гаўрылы Гарэцкага і 95-годдзя першага выдання «Гісторыі беларускае літаратуры» Максіма Гарэцкага) : матэрыялы XXIII Гарэцкіх чытанняў, Мінск, 17 красавіка 2015 г. / Дзярж. музей гісторыі бел. літ., Рэспубліканскі фонд імя братоў Гарэцкіх, Цэнтр даследав. бел. культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі ; Р. Гарэцкі (адк. рэд.). – Мінск, 2015. – С. 93–98.

28. Глазман, Л. Матыў ілюзорнасці ў апавяданнях Л. Андрэева і М. Гарэцкага / Л. Глазман // IX Машеровские чтения : материалы международной научно-практической конференции студентов, аспирантов и молодых ученых, Витебск, 25 сентября 2015 г. / Витебский гос. ун-т; редкол.: И. М. Прищепа (гл. ред.) [и др.]. – Витебск : ВГУ имени П. М. Машерова, 2015. – С. 160–162.

29. Глазман, Л. Праблема нацыянальнага адраджэння ў апавяданнях Максіма Гарэцкага пра ваенныя і рэвалюцыйныя падзеі / Л. Глазман // Чацвёрты Міжнародны Кангрэс даследчыкаў Беларусі : працоўныя матэрыялы / Том 4. – Kaunas, Lithuania, 2015. – С. 164–167.

30. Глазман, Л. Я. Асэнсаванне мінулага ў апавяданнях Максіма Гарэцкага / Л. Я. Глазман // Полесский регион и наука XXI века : материалы IX Респ. науч.-практ. интернет-конференции магистрантов, аспирантов и молодых ученых, Мозырь, 26 июня 2015 г. / Мозыр. гос. пед. ун-т имени И. П. Шамякина. – Мозырь : МГПУ имени И. П. Шамякина, 2015. – С. 95–97.

31. Глазман, Л. Я. Матыў выкрыцця ў сатырычных апавяданнях Л. Андрэева і М. Гарэцкага // Мир языков: ракурс и перспектива : материалы VI Междунар. науч. практ. конф., Минск, 22 апреля 2015 г. : в 7 т. / редкол.: Н. Н. Нижнева (отв. ред.) [и др.]. – Т. 5 – Минск : БГУ, 2015. – С. 26–28.

32. Глазман, Л. Я. «Малая» проза як форма адлюстравання самаідэнтыфікацыі асобы (на матэрыяле твораў Л. Андрэева і М. Гарэцкага) / Л. Я. Глазман // Беларуская мова і літаратура ў славянскім этнакультурным кантэксце: матэрыялы II Рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі, Віцебск, 19–20 лістапада 2015 г. / Віц. дзярж. ун-т ; рэдкал.: Г. А. Арцямёнак (адк. рэд) [і інш.]. – Віцебск : ВДУ імя П. М. Машэрава, 2015. – С. 186–189.

33. Глазман, Л. Роля героя-«правакатара» ў апавяданнях Л. Андрэева і М. Гарэцкага / Л. Глазман // Наука – образованию, производству, экономике : материалы XXI (68) Региональной научно-практической конференции сотрудников и аспирантов, Витебск, 10–11 февраля 2016 г. : в 2 т. / Вит. гос. ун-т; редкол. И. М. Прищепа (гл. ред.) [и др.]. – Витебск : ВГУ имени П. М. Машерова, 2016. – Т. 1. – С. 117–118.

34. Глазман, Л. Асноўныя спосабы раскрыцця самаідэнтыфікацыі асобы ў апавяданнях Л. Андрэева і М. Гарэцкага / Л. Глазман // Славянскія літаратуры ў кантэксце сусветнай : да 750-годдзя са дня нараджэння Дантэ Аліг'еры і 85-годдзя Уладзіміра Караткевіча : матэрыялы XII Міжнароднай

навуковай канферэнцыі, Мінск, 22–24 кастрычніка 2015 г.: у 2 ч. Ч. 2 / пад рэд. Г. М. Бутырчык. – Мінск : БДУ , 2016. – С. 202–208.

35. Глазман, Л. Самаідэнтыфікацыя асобы ў «Сібірскіх абразках» Максіма Гарэцкага / Л. Глазман // Максім і Гаўрыла Гарэцкія : жыццё і творчасць (да 95-годдзя з дня нараджэння Галіны Максімаўны Гарэцкай і 50-годдзя вяртання на Беларусь Гаўрылы Іванавіча Гарэцкага) : матэрыялы XXIV Гарэцкіх чытанняў, Мінск, 16 чэрвеня 2016 г. / Дзярж. музей гісторыі бел. літ., Рэсп. фонд імя братоў Гарэцкіх, Цэнтр даслед. беларус. культуры, мовы і літ. НАН Беларусі ; Р. Гарэцкі (адк. рэд.). – Мінск, 2016. – С. 84–88.

36. Глазман, Л. Специфика национального самосознания в «малой» прозе Л. Андреева / Л. Глазман // Наука – образованию, производству, экономике : материалы XXII (69) Региональной научно-практической конференции сотрудников и аспирантов, Витебск, 9–10 февраля 2017 г. : в 2 т. / Вит. гос. ун-т; редкол. И. М. Прищепа (гл. ред.) [и др.]. – Витебск : ВГУ имени П. М. Машерова, 2017. – Т. 1. – С. 120–121.

37. Глазман, Л. Самаідэнтыфікацыя асобы ў паслярэвалюцыйныя часы ў «малой» прозе Л. Андрэева і М. Гарэцкага / Л. Глазман // Максім і Гаўрыла Гарэцкія. Жыццё і творчасць : (прысвячаецца літаратурна-мастацкай і навуковай дзейнасці братоў Гарэцкіх) : матэрыялы XXV Гарэцкіх чытанняў, Мінск, 22 чэрвеня 2017 г. / Дзярж. музей гісторыі бел. літ., Цэнтр даследав. беларус. культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі ; рэдкал.: Р. Гарэцкі (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : РІВШ, 2017. – С. 55–60.

38. Глазман, Л. Самаідэнтыфікацыя асобы ў эпісталярыях Л. Андрэева і М. Гарэцкага (жанрава-стылёвы аспект) / Л. Глазман // Наука – образованию, производству, экономике : материалы XXIII (70) Региональной научно-практической конференции сотрудников и аспирантов, Витебск, 15 февраля 2018 г. : в 2 т. / Вит. гос. ун-т; редкол. И. М. Прищепа (гл. ред.) [и др.]. – Витебск : ВГУ имение П. М. Машерова, 2018. – Т. 1. – С. 139–140.

**Вучэбна-метадычныя матэрыялы**

39. Глазман, Л. Я. Культурна-гістарычная школа / Л. Я. Глазман // Металалогія літаратуразнаўчых даследаванняў : вучэб.-метад. матэрыялы для магістрантаў філал. фак. / Л. Д. Сінькова [і інш.] : пад рэд. Л. Д. Сіньковай. – Мінск : БДУ, 2016. – С. 26–36.

# РЭЗЮМЭ

**Глазман Любоў Якаўлеўна**

**Самаідэнтыфікацыя асобы ў «малой» прозе М. Гарэцкага і Л. Андрэева**


**Ключавыя словы:** беларуская проза, руская проза, кампаратыўны аналіз, самаідэнтыфікацыя асобы, эпісталярый, нацыянальна-культурная спецыфіка, «ускладненая» ідэнтычнасць, «дваістасць» свядомасці, маска.

**Мэта даследавання:** вызначэнне мастацкіх формаў самаідэнтыфікацыі асобы ў «малой» прозе М. Гарэцкага і Л. Андрэева ў аспекце камапартыўнага аналізу.

**Метады даследавання.** Зварот да параўнальна-гістарычнага метаду, тэорыі кампаратыўнага вывучэння літаратурных з'яў дазваляюць суаднесці творчыя пазіцыі М. Гарэцкага і Л. Андрэева з улікам адрозных культурна-літаратурных традыцый; выкарыстанне культурна-гістарычнага метаду і элементаў кантэкстуальнага аналізу дае магчымасць даследаваць творчую спадчыну абраных аўтараў з улікам рэалій першай трэці XX стагоддзя.

**Атрыманыя вынікі і іх навізна.** У дысертацыі ўпершыню ў параўнальным аспекце, на матэрыяле «малой» прозы М. Гарэцкага і Л. Андрэева, вылучаны мастацкія выявы самаідэнтыфікацыі асобы персанажаў у суаднесенасці з нацыянальна-культурнай спецыфікай беларускай і рускай літаратурнай класікі; вызначаны асноўныя ідэйна-мастацкія прынцыпы, раскрыты аксіялагічны, нацыянальны, сацыяльны аспекты адлюстравання самаідэнтыфікацыі асобы ў творах М. Гарэцкага і Л. Андрэева з выяўленнем спецыфічных і падобных аўтарскіх інтэнцый; істотна ўдакладнены і паглыблены веды пра рэаліі беларуска-рускіх узаемасувязей з пункту гледжання літаратуразнаўства XXI ст.

**Рэкамендацыі па выкарыстанні атрыманых вынікаў.** Матэрыялы і вынікі навуковай работы могуць быць выкарыстаны для далейшага параўнальнага вывучэння беларускай і рускай літаратур першай трэці XX ст. і мяжы XX – XXI ст.ст., даследаванняў на сумежжы літаратуразнаўства і іншых дысцыплін гуманітарнага профілю (культуралогіі, сацыялогіі, філасофіі); пры стварэнні навучальных дапаможнікаў па гісторыі беларускай і рускай літаратур пазначанага перыяду, тэорыі літаратуры; у адукацыйнай практыцы.

**Галіна прымянення:** літаратуразнаўства (гісторыя літаратуры, тэорыя літаратуры); дысцыпліны гуманітарнага профілю (сацыялогія, філасофія, культуралогія).

# РЕЗЮМЕ

## Глазман Любовь Яковлевна

## Самоидентификация личности в «малой» прозе М. Горецкого и Л. Андреева

**Ключевые слова:** белорусская проза, русская проза, самоидентификация личности, эпистолярий, национально-культурная специфика, радикальные социальные изменения, «затрудненная идентичность», «двойственность» сознания, маска.

**Цель исследования:** определение художественных форм самоидентификации личности в «малой» прозе М. Горецкого и Л. Андреева в аспекте компаративного анализа.

**Методы исследования.** Обращение к сравнительно-историческому методу, теории компаративного изучения литературных явлений позволяют соотнести творческие позиции М. Горецкого и Л. Андреева с учетом разных культурно-литературных традиций; использование культурно-исторического метода и элементов контекстуального анализа дает возможность исследовать творческое наследие выбранных авторов с учетом реалий первой трети XX века.

**Полученные результаты и их новизна.** В диссертации впервые в сравнительном аспекте, на материале «малой» прозы М. Горецкого и Л. Андреева, выделены художественные формы самоидентификации личности персонажей в соотнесенности с национально-культурной спецификой белорусской и русской литературной классики; определены основные идейно-художественные принципы, раскрыты аксиологический, национальный, социальный аспекты изображения самоидентификации личности в произведениях М. Горецкого и Л. Андреева с выявлением специфичных и сходных авторских интенций; существенно уточнены и углублены знания о реалиях белорусско-русских взаимосвязей с точки зрения литературоведения XXI века.

**Рекомендации по использованию полученных результатов.**

Материалы и результаты научной работы могут быть использованы для дальнейшего сравнительного изучения белорусской и русской литератур первой трети XX в. и рубежа XX – XXI вв., исследований на границе литературоведения и других дисциплин гуманитарного профиля (культурологии, социологии, философии); при написании учебных пособий по истории белорусской и русской литератур указанного периода, теории литературы; в образовательной практике.

**Область применения:** литературоведение (история литературы, теория литературы); дисципины гуманитарного профиля (социология, философия, культурология).

## SUMMARY

**Liubou Hlazman**

**Self-identification in M. Haretsky's and L. Andreyev's short stories**

**Key words:** Belarussian prose, Russian prose, self-identification, short stories, epistolaries, national and cultural specifics, radical social changes, «impeded» identity, «duality» of consciousness, mask.

**The aim of the research** is definition of artistic forms of self-identity in M. Goretsky's and L. Andreev's short stories in the aspect of comparative analysis.

**Research methods.** The use of the comparative-historical method, the theory of comparative study of literary phenomena allows us to correlate M. Haretsky's and L. Andreyev's creative positions with the consideration of different cultural and literary traditions; the use of the cultural-historical method and elements of contextual analysis makes it possible to explore the creative heritage of the authors, taking into account the realities of the first third of the twentieth century.

**The scientific novelty and the research results.**

In the thesis for the first time the artistic forms of self-identification of the characters' personality are revealed in correlation with the national and cultural specifics of the Belarusian and Russian literary classics in comparative aspect on the material of M. Haretsky's and L. Andreyev's short stories; the main ideological and artistic principles are defined; the axiological, national, social aspects of the self-identification image in M. Goretsky's and L. Andreev's works are revealed, individual and similar author intentions are investigated; knowledge of the realities of the Belarusian-Russian interrelations are clarified and deepened substantially in terms of literary criticism of the XXI century.

**Usage recommendations.** The results can be used for further comparative study of the Belarusian and Russian literatures of the first third of the 20th century and the turn of the 20th – 21st centuries, for studies on the boundaries of literary studies and other humanitarian disciplines (culturology, sociology, philosophy); for writing textbooks on the history of Belarusian and Russian literature of this period, on the theory of literature; in educational practice.

**The application area.** Literary criticism (history of literature, theory of literature); disciplines of a humanitarian profile (sociology, philosophy, cultural studies).